**РЫЕР Я.Р., доктар гістарычных навук, прафесар, Магілёўскі Дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова. Магілёў. Беларусь.**

# ДАСЛЕДАВАННІ ГАРАДЗІШЧА «ЗМЯЁЎКА» У МАГІЛЁВЕ.

Гарадзішча «Змяёўка», ці інакш, Пелагееўскае, размешчана на правым беразе р. Дубравенкі ў 1,5 км вышэй яе ўпадзення ў Дняпро, на паўднёвым баку пр. Міра. На сённяшні час гэта — адзіны з захаваўшыхся ў рэльефе археалагічны помнік у межах горада, дакладней — фрагмент помніка. Бо захавалася толькі яго невялікая частка.

Упершыню гарадзішча абследавалася вядомым даследчыкам мясцовых старажытнасцей Е.Р.Раманавым у 1905 г. Ён адзначаў, што гарадзішча мела два валы і яры, якія, аднак, яшчэ ў тыя часы ўжо былі развораны. Частка вала, якая захавалася, узвышалася над пляцоўкай на 4 м, а сама пляцоўка была авальнай, 25х16,5 м. Тады ж Е.Р.Раманаў зрабіў невялікія раскопкі, але без асаблівых вынікаў.

У 1930 г. шурфоўку на помніку зрабіў В.Р.Тарасенка. Як і Раманаў, ён адзначыў беднасць культурнага слою, у якім былі знойдзены рэшткі грубаляпной керамікі, вуголле, абпаленныя камені і рэшткі абгарэлага дрэва. Гэтыя знаходкі дазволілі Тарасенку аднесці помнік да ранняга жалезнага веку.

У «Нарысах па археалогіі Беларусі» (Ч.2. Мн. 1972) адзначаны знаходкі на гарадзішчы і матэрыялаў пачатку ІІ тыс.н.э., сінхронных знойдзенным на Валу. Але даваенныя звесткі такіх сведчанняў не ўтрымлівалі. Дарэчы, самі тыя матэрыялы загінулі разам з іншымі экспанатамі Магілёўскага музея ў вогнішчы вайны.

У пачатку 50-х гг. пры замацаванні берага пляцоўка гарадзішча была штучна задзернавана, што парушыла верхнюю частку культурнага слою. У пачатку 60-х гг. пры пабудове пр. Міру частка помніка была разбурана. А з 1969 г., у сувязі з будаўніцтвам комплекса Палаца піянераў, пачала інтэнсіўна разбурацца і астатняя частка гарадзішча. У выніку, калі ў 1969 г. захаваўшаяся плошча помніка налічвала 255 кв.м, то ў 1973 г. — толькі 96,25 кв.м. і тады ў абласным музеі, не без супрацiўлення тагачаснага інспектара па ахове помнікаў, было вырашана зрабіць выратавальныя раскопкі на помніку.

На момант раскопак рэшткі гарадзішча ўяўлялі сабой трохкутнік, які ўзвышаўся над Дубравенкай на 15-16 м. У ходзе даследаванняў была зроблена зачыстка абрыва, які абмяжоўваў вал і пляцоўку з поўдня і закладзены 2 шурфа. Усяго было ўскрыта 22 кв.м.

Вынікі раскопак сведчаць аб тым, што большая частка культурнага слою была разбурана: перапахана пры ўмацаванні берага. У гэтым парушанным слое былі знойдзены фрагменты як грубаляпной керамікі ранняга жалезнага веку, так і выробленнай на ганчарным крузе керамікі XII-XIII стст. Фрагменты посуду, аналагічныя апошнім, былі знойдзены і пад пляцоўкай, на беразе Дубравенкі. У разбуранай жа частцы культурнага слою быў знойдзены і жалезны ножык.

Але ніжняя, перадмацерыковая частка культурнага слою, больш значная каля рэштак вала, не была парушана. Яе аналіз дазваляе зрабіць некаторыя, хаця і сціплыя высновы.

У заходняй частцы пляцоўкі, да валу, прымыкала жытло, ад якога захаваўся ўваход, ямы ад апорных слупоў у мацерыке, рэшткі глінянай абмазкі сцен і сляды ўтрамбаванай земляной падлогі. Жытло было выцягнута з паўднёвага захаду на

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паўночны ўсход на 6-6,5 м. Паколькі пляцоўка гарадзішча была накланена да ракі, а падлога зроблена гарызантальна, са стараны ўваходу жытло было заглыблена толькі на 10-20 см, а на супрацьлеглым баку, каля вала — на 1 м. У непарушанай частцы культурнага слою жытла былі знойдзены сцэпленыя паміж сабою 2 бронзавых бранзалета з разведзенымі патоўшчанымі канцамі і геаметрычным арнаментам на ніх. Такія бранзалеты вядомы ў старажытнасцях латгалаў, а таксама і ў Падняпроў'і і датуюцца VI-VIIIстст.н.э. Паколькі знойдзенная побач кераміка не супярэчыць гэтай даціроўцы, можна лічыць, што і само жытло існавала ў адзначаныя часы.

Захаваўшаяся непарушанная перадмацерыковая частка культурнага слою жыла была насычана слядамі агню. Сляды апошняга прасочаны і ў іншых месцах на мацерыке, які часткова быў пракалены. Таму можна меркаваць, што і жытло, і наогул, даследаванная частка гарадзішча пацярпела ад пажару недзе у трэцяй чвэрці I тыс.н.э., калі, дарэчы, адбывалася засяленне разглядаемай частцы Падняпроў'я славянамі. Знаходка бранзалетаў у перапляценным стане сведчыць, што яны былі хутчэй за ўсё схаваны, што таксама падцвярджае меркаванне аб пажары ў выніку ваеннага сутыкнення на гарадзішчы. Сляды агню, нагадаю, назіралі, як адзначалася, Раманаў і Тарасенка.

Такім чынам, тыя невялікія па колькасці знаходкі сведчаць аб заселенасці помніка з ранняга жалезнага веку балтскім насельніцтвам. Знаходкі XII-XIII стст. адносяцца ўжо да іншай эпохі, сінхронныя іншым матэрыялам з розных частак сучаснага горада. На жаль парушанасць культурнага слою, у якім яны знойдзены, не дазваляе рэканструяваць жыццё на гарадзішчы ў тыя часы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова